# Адбылося чарговае пасяджэнне падкамітэту па інфармацыйных тэхналогіях па падрыхтоўцы да правядзення ў 2019 года ў Рэспубліцы Беларусь II Еўрапейскіх гульняў

28 снежня 2017 года ў Міністэрстве сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь адбылося чарговае пасяджэнне падкамітэту па інфармацыйных тэхналогіях па падрыхтоўцы да правядзення ў 2019 года ў Рэспубліцы Беларусь II Еўрапейскіх гульняў пад старшынствам кіраўніка падкамітэту Міністра сувязі і інфарматызацыі Сяргея Папкова з удзелам шырокага кола зацікаўленых.
На пасяджэнні разгледжаны ход выканання асноўных задач, вызначаных Падкамітэту. У прыватнасці, прааналізаваны прапановы кампаній, якія падалі заяўку на выкананне функцый стварэння праграмна-тэхнічнага блока II Еўрапейскіх гульняў. Найбольш эфектыўнае тэхнічнае рашэнне будзе прадстаўлена на разгляд Рэспубліканскага аргкамітэта.

Прысутныя абмеркавалі пытанні тэхнічнай гатоўнасці прадастаўлення ў перыяд правядзення II Еўрапейскіх гульняў бясплатнага доступу да глабальнай камп'ютэрнай сеткі Інтэрнэт з дапамогай тэхналогіі Wi-Fi; тэхнічныя аспекты па арганізацыі Міжнароднага вяшчальнага цэнтра.

Адзначана, што з мэтай якаснай падрыхтоўкі да правядзення II Еўрапейскіх гульняў 2019 года ў Рэспубліцы Беларусь кампаніі вывучаюць замежны вопыт па арганізацыі спартыўных мерапрыемстваў міжнароднага маштабу.

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/28-12-2017-2616*